А.І. Вайцяховіч

# Расавая палітыка нацыстаў і яе прымяненне да яўрэйскага насельніцтва

XX стагоддзе ўвайшло ў гісторыю не толькі як стагоддзе масавых рэвалюцыйных рухаў, імклівага развіцця навукі і тэхнікі, якія адкрылі магчымасці для паляпшэння ўмоў жыцця чалавецтва. Яно ўвайшло ў гісторыю самымі кровапралітнымі войнамі, разгулам фашызму, генацыдам людзей розных нацыянальнасцей.

Фашызм упершыню ў гісторыі чалавецтва паставіў перад сабой і абвясціў як дзяржаўную задачу знішчэнне цэлых народаў. Але пра Халакост доўгі час не было прынята гаварыць. Толькі ў 90-я гг. пачалі з'яўляцца першыя даследаванні. Дагэтуль даследчыкі павярхоўна закранаюць дадзенае пытанне.

Палітыка генацыду з'яўлялася састаўной часткай гітлераўскай акупацыйнай палітыкі ў адносінах да насельніцтва захопленых Германіяй тэрыторый пад час Другой сусветнай вайны. Не выключэннем у гэтым плане з'яўляецца і Беларусь. Задоўга да пачатку агрэсіі супраць Савецкага Саюза Гітлер казаў

аднаму са сваіх прыбліжаных – Раушнінгу: «Мы павінны развіваць тэхніку абязлюджвання. Калі вы спытаеце мяне, што я разумею пад абязлюджваннем, я адкажу, што маю на ўвазе ўстараненне цэлых расавых адзінак, і гэта тое, што я намераны здзейсніць, гэта, груба кажучы, мая задача» [1].

Тэарэтычнай базай для акупацыйнага рэжыму была расавая тэорыя аб няраўнацэннасці народаў і аб выключнай ролі германскай нацыі, якая павінна была служыць абгрунтаваннем права Гітлера і нацысцкай Германіі панаваць над іншымі дзяржавамі. Яна давала не толькі пачуццё перавагі параўнальна вузкаму колу фюрэраў, далучаных да «арыйскага ядра» ўнутры дзяржавы, але і нардычнай ці арыйскай расе ў цэлым. Галоўным цэнтрам арыйскай расы з'яўлялася Германія і менавіта гэта давала ёй права прэтэндаваць на асобую ролю ў свеце. Як выказаўся Гімлер: «Германія – сэрца і мозг Еўропы, цэнтр ствараючай арыйскай расы» [2]. А калі так, то ўсе астатнія народы адыгрываюць у адносінах да яе другарадную ролю. Вышэйшая раса выконвае нейкую гістарычную місію, сутнасць якой заключаецца ў тым, каб падпарадкоўваць сабе дзяржавы, населеныя іншымі расамі, і знішчаць іх як расава непаўнацэнных.

Таму галоўнай мэтай унутранай і знешняй палітыкі нямецкай нацыянал-сацыялістычнай дзяржавы абвяшчалася дасягненне сусветнага панавання і атрыманне «жыццёвай прасторы» на Усходзе – у Польшчы і Расіі для выбранага германскага народа. Гітлер пісаў у кнізе «Мая барацьба»: «Наша дзяржава будзе перш за ўсё імкнуцца ўсталяваць здаровую, натуральную жыццёвую прапорцыю паміж колькасцю нашага насельніцтва і тэмпам яго росту, з аднаго боку, і колькасцю і якасцю нашых тэрыторый – з другога. Толькі так нашая знешняя палітыка можа забяспечыць лёс нашай расы, аб'яднанай у нашай дзяржаве. Здаровай прапорцыяй мы можам лічыць толькі такія суадносіны паміж указанымі двума велічынямі, якія цалкам і поўнасцю забяспечваюць пражытак народа харчаваннем нашай асабістай зямлі. Іншае становішча рэчаў, калі яно працягваецца нават стагоддзямі і тысячагоддзямі, з'яўляецца ненармальным і нездаровым. Раней ці пазней такое становішча прынясе вялікую шкоду народу і можа прывесці да яго поўнага знішчэння. Дзеля таго, каб народ змог забяспечыць сабе сапраўдную волю існавання, яму патрэбна дастаткова вялікая тэрыторыя» [3].

Можна цалкам пагадзіцца з меркаваннем эстонскіх гісторыкаў А. Адамсана і С. Валдмаа: «Вядома, мэты ўсіх вялікіх дзяржаў у вайне былі карыслівымі, але асабліва гэта характэрна для мэт Германіі: калі бальшавікі змагаліся ў імя таго, што яны лічылі шчасцем для ўсяго чалавецтва, то германскія нацыянал-сацыялісты змагаліся ў імя панавання адной расы – светлавалосых германцаў, «арыйцаў» – і былі гатовыя сцерці з твару зямлі ўсе расы, якія ў іх вачах уяўляліся «ніжэйшымі» ці «непаўнацэннымі» [4].

На думку А. Гітлера, чалавецтва патрэбна падзяліць на тры расы: заснавальнікі культуры, яе носьбіты і разбуральнікі. Толькі арыйскую расу можна лічыць заснавальніцай культуры, бо яна «заклала падмурак і ўзвяла сцены храма чалавечых тварэнняў» [5]. Азіяцкія народы, напрыклад японцы і кітайцы, толькі пераняла арыйскую культуру, прыдаўшы ёй сваю форму. Таму яны з'яўляюцца яе носьбітамі. У той жа час яўрэйскую расу можна аднесці да разбуральнікаў культуры. У сваёй кнізе «Мая барацьба» Гітлер сцвярджаў: «Яўрэйскі народ – пры ўсім тым, што знешне ён здаецца вельмі развітым, – на самай справе ніякай праўдзівай культуры не мае, а ў асаблівасці не мае ніякай сваёй асабістай культуры. Знешняя культура сучаснага яўрэя на справе ёсць толькі сапсаваная ім культура іншых народаў» [3, с. 256].

Па расавай лесвіцы палякі – ворагі немцаў, колькасць якіх патрэбна было максімальна зменшыць, а дзяржаўнасць ліквідаваць, не дапускаючы ніякіх

формаў самаўпраўства. Аднак татальнага знішчэння польскай нацыі гітлераўцы не прадугледжвалі.

Наступнымі пасля палякаў ішлі рускія і беларусы, якія знаходзіліся ў некалькі лепшым становішчы. Гэта праяўлялася ў назначэнні беларусаў на пасады ў мясцовым самакіраванні на акупіраваных тэрыторыях.

Але славяне, па словах А. Гітлера, «нарадзіліся быць рабамі і самі адчуваюць неабходнасць мець гаспадара над сабой» [6].

Больш высокую прыступку ў пірамідзе расавай тэорыі займалі літоўцы. Яны яшчэ зусім нядаўна валодалі сваёй дзяржаўнасцю і мелі права на самакіраванне, як і два іншых прыбалтыйскіх народа – латышы і эстонцы. Аднак, з-за мяркуемага расавага змяшэння з палякамі іх нацысты не адносілі да арыйскай нацыі.

Наступнымі па шкале ішлі ўжо асабіста арыйскія народы. Гэтага гонару з насельніцтва СССР удастоіліся толькі казахі, татары Крыма, калмыкі, асецінцы, інгушы, чачэнцы і іншыя народы Паўночнага Каўказа. Яны ў перспектыве падвяргаліся германізацыі і павінны былі скласці адзіную супольнасць з германскім народам.

За межамі Савецкага Саюза ў лік арыйцаў былі ўключаны французы, італьянцы, іспанцы, партугальцы, балгары, венгры, сербы, туркі і іншыя. Пры гэтым італьянцы, венгры, румыны, славакі, харваты і балгары лічыліся асобымі, «саюзнымі народамі», што павышала іх статус з пункту гледжання расавай тэорыі.

Далей, бліжэй да вяршыні расавай піраміды, ішлі германскія народы: датчане, нарвежцы, чэхі, англічане, шведы, фіны. Іх меркавалася выкарыстаць у першую чаргу для каланізацыі «ўсходніх тэрыторый».

Але расавая дактрына нацыянал-сацыялізму не пакідала месца «малым народам» – яўрэям і цыганам, якіх паступова планавалася знішчыць.

Расавая ідэалогія ў Германіі прайшла некалькі стадый. Першую патрэбна лічыць тэарэтычнай, падрыхтоўчай. Нацысты праводзілі адбор, раздзяленне ўсяго народа на расава паўнацэнных і непаўнацэнных людзей. Пасля гэтага апошніх пачалі паступова пазбаўляць усіх грамадзянскіх правоў. З першай інструкцыі да закона аб імперскім грамадзянстве ад 14 лістапада 1935 г. вынікае: «Яўрэй не можа быць імперскім грамадзянінам. Ён не мае права голасу пры рашэнні палітычных пытанняў; ён не можа займаць грамадскія пасады» [7]. Праз два гады 12 лістапада 1937 г. Г. Герынг падпісаў загад аб устараненні яўрэяў з эканамічнага жыцця Германіі: «Пачынаючы з 1 студзеня 1939 г. яўрэям забараняецца займацца рознічным гандлем, рассылкай тавару, прыняццем заказаў і самастойным рамяством».

Наступны этап – «канчатковае вырашэнне» – пагалоўнае знішчэнне, ліквідацыя спачатку яўрэяў. Затым расавая палітыка пачала распаўсюджвацца і на іншыя народы.

Палітыка нацызму ў дачыненні да яўрэяў была супярэчлівай. Не існавала адзінай дамоўленасці наконт «канчатковага вырашэння яўрэйскага пытання». Трэба адзначыць, што сярод нацыянал-сацыялістаў было не менш трох антысеміцкіх груп, кожная з якіх трактавала яўрэйскае пытанне па-свойму.

Да так званай народнай групы адносіліся Вальтэр Гросс, кіраўнік упраўлення расавай палітыкі НСДАП, і Бернхард Лёзенер, рэферэнт міністэрства ўнутраных спраў па расавым пытанням, якія прытрымліваліся думкі аб адхіленні яўрэяў ад магчымасці ўздзейнічаць на палітыку і культуру, але былі гатовы актыўна супрацоўнічаць з імі ў галіне эканомікі.

Другую групу ўзначальваў Альфрэд Розэнберг, вакол якога групаваліся тэарэтыкі расізму.

Да трэцяй групы належаў адкрыты вораг яўрэяў Юліус Штрайхер, да якога пазней прымкнуў Йёзэф Гебельс [8].

Кожная з названых груповак пасля 1933 г. праводзіла палітыку нацыянал-сацыялізму ў адносінах да яўрэяў. У першыя месяцы прыходу нацыстаў да ўлады вядучым аказаўся антысемітызм Штрайхера: крывавыя пагромы ў сакавіку 1933 г., звальненне з працы яўрэйскіх чыноўнікаў, дактароў і юрыстаў, першая арыезацыя яўрэйскіх прадпрыемстваў. У 1934 г. гэты тэрор спаў. Вырашэннем яўрэйскага пытання заняліся памяркоўныя антысеміты. Аднак, ужо праз год становішча зноў змянілася. На гэты раз тон задаваў І. Гебельс.

Унтэрштурмфюрэр СС Леапольд фон Мільдэнштайн палічыў неабходным скончыць з антысеміцкім калейдаскопам у партыі і прапанаваў вырашыць раз і назаўсёды яўрэйскае пытанне шляхам высялення з Германіі ўсіх яўрэяў. 24 студзеня 1939 г. была створана Цэнтральная імперская служба па справах яўрэйскай эміграцыі, у склад якой уваходзілі прадстаўнікі усіх ведамстваў, што мелі непасрэдныя адносіны да гэтага пытання.

Спачатку планавалася выслаць іх у Палесціну, але 1 чэрвеня 1937 г. міністр замежных спраў фон Нойрат выступіў супраць стварэння ў гэтым рэгіёне яўрэйскай дзяржавы, па прычыне таго, што там няма магчымасці прыняць ўсіх яўрэяў.

Яшчэ больш нерэальным і далёкім ад рэчаіснасці быў план перасялення іх на востраў Мадагаскар, які ўзнік пасля перамогі над Францыяй. Адным з ідэолагаў гэтага плану стаў саветнік пасольства Франц Радэмахер, кіраўнік яўрэйскага рэферата ў міністэрстве замежных спраў. Ён прапаноўваў уключыць у мірны дагавор з Францыяй пункт аб перадачы Мадагаскара Германіі. Пасля высялення адтуль усіх французаў там можна было б стварыць гета для чатырох мільёнаў яўрэяў.

Пасля паспяховага пачатку вайны з Савецкім Саюзам было вырашана выселіць яўрэяў у Прыпяцкія балоты. Аднак, пасля паражэння пад Масквой у канцы 1941 г. пра гэта не магло быць і размовы [9].

Калі геаграфічнае ўстараненне яўрэяў аказалася недасягальным, нацысты прыбеглі да самага радыкальнага сродку – «канчатковаму вырашэнню».

Дакладнай даты палітычнага рашэння нацыянал-сацыялістаў пра поўнае знішчэнне яўрэяў канчаткова не высветлена. Пісьмовага загада Гітлера пра гэта не знойдзена. Большасць гісторыкаў зараз пагаджаюцца з тым, што да пачатку вайны не было вызначанага плана забойства яўрэяў, а «канчатковае вырашэнне», як называлі палітыку знішчэння ўсіх яўрэяў, было распрацавана ўжо пад час вайны.

Як бы там ні было, Г. Герынг 31 ліпеня 1941 г. даў указанне Гейдрыху «прадставіць яму тэрмінова праект арганізацыйных і матэрыяльных мерапрыемстваў па канчатковым рашэнні яўрэйскага пытання». Але Гітлер аддаў свой загад значна раней. Гісторык Гельмут Краузнік у сувязі з гэтым піша: «Цалкам відавочна: чым больш у А. Гітлера выспяваў план разгрому Савецкага Саюза, апошняга верагоднага праціўніка на Еўрапейскім кантыненце, тым выразней у яго фарміравалася думка «канчатковага рашэння яўрэйскага пытання» – знішчэнне яўрэяў на падуладных яму тэрыторыях. Магчыма, у сакавіку 1941 г., калі ён вырашыў расстрэльваць камісараў Чырвонай Арміі, і аддаў загад аб ліквідацыі яўрэяў» [8, с. 313]. Пра гэта ж сведчыць і той факт, што 3 сакавіка 1941 г. А. Гітлер упершыню сказаў, што на рэйхсфюрэра СС Г. Гімлера будзе ўскладзена задача па знішчэнні яўрэйска-бальшавіцкага кіраўніцтва на Усходзе: «Яўрэйска-бальшавіцкая інтэлігенцыя, – заявіў ён, – угнятаўшая да гэтай пары народ, павінна быць знішчана... У першую чаргу размова ідзе пра бальшавісцкіх лідэраў і камісараў».

Пад кіраўніцтвам Р. Гейдрыха 20 студзеня 1942 г. у Ванзэе адбылася нарада вышэйшых прадстаўнікоў шэрагу міністэрстваў гітлераўскай Германіі, дзе было прынята «канчатковае вырашэнне яўрэйскага пытання», якое павінна было ахапіць усе дзяржавы Еўропы і ў тым ліку і Савецкі Саюз [10]. З асноўным дакладам па пытанні выступіў Р. Гейдрых. Адкрываючы пася-

джэнне, ён патрабаваў ад прадстаўнікоў цэнтральных інстанцый узгодненых дзеянняў, пералічыў дзяржавы, дзе жывуць яўрэі, адзначыў аб'ёмы «працы». Па аб'яўленым плане меркавалася знішчыць звыш 11 мільёнаў чалавек. Р. Гейдрых не абышоў ніводнай еўрапейскай дзяржавы – сярод трыццаці ім указаных фігурыравалі саюзнікі, нейтралы, акупіраваныя. Усіх улічыў: звыш 5 мільёнаў яўрэяў Савецкага Саюза, 330 тысяч яўрэяў Англіі, 6 тысяч іспанскіх яўрэяў, 3 тысячы партугальскіх, 1300 яўрэяў Нарвегіі.

Гэтая нарада пацвердзіла нязменнасць палітыкі гітлераўскага генацыду, намеры ажыццявіць мэты развязанай агрэсіўнай вайны.

6 сакавіка 1942 г. А. Эйхман правёў у Берліне спецыяльнае пасяджэнне па пытанні дэпартацыі яўрэяў Еўропы ў лагеры смерці. У ім удзельнічалі прадстаўнікі НСДАП, міністэрстваў, цэнтральных упраўленняў СС, рэферэнты па яўрэйскім пытанні.

Пасля завяршэння ўсіх прыгатаванняў у красавіку 1942 г. Г. Гімлер аддаў загад: «Фюрэр распарадзіўся вырашыць канчаткова яўрэйскае пытанне. Вырашэнне гэтага пытання даручаецца начальніку паліцыі аховы і СД і інспектару па канцэнтрацыйным лагерам. Гэта так званае канчатковае вырашэнне не распаўсюджваецца пакуль на працоўную частку яўрэяў мужчынскага і жаночага полу, якія павінны выкарыстоўвацца для працы ў канцэнтрацыйных лагерах» [11].

Такім чынам, паступова пачаў рэалізоўвацца план знішчэння яўрэйскага насельніцтва, апрабацыя якога праводзілася спачатку непасрэдна на тэрыторыі Германіі, затым Польшчы і СССР Наяўнасць планаў, дырэктыў і загадаў, падпісаных яшчэ да пачатку баявых дзеянняў, сведчыць пра тое, што, па-першае, гітлераўскія вярхі наперад злучылі ваенна-стратэгічнае планаванне з планаваннем злачынстваў; па-другое, іх практычнае ажыццяўленне не было вынікам якіх-небудзь эксцэсаў з боку асобных недысцыплінаваных ваеннаслужачых вермахта, а з'яўлялася рэалізацыяй загадзя намечаных планаў, і па-трэцяе, паколькі ў планаванні гэтых злачынстваў удзельнічаў увесь механізм дзяржаўнай улады Германіі, то Нюрнбергскі працэс цалкам абаснавана вызначыў іх як змову.

## ЛІТАРАТУРА


1. ***Полторак А.И.*** Нюрнбергский эпилог / Под ред. ***А.А. Беркова, В.Д. Ежова***. – 3-е изд. – М., 1983. – С. 4.
2. ***Мельников Д., Черная Л.*** Империя смерти: Аппарат насилия в нацистской Германии. 1933–1945. – М., 1987. – С. 290.
3. ***Гитлер А.*** Моя борьба. – М., 2000. – С. 255.
4. ***Соколов Б.В.*** Адольф Гитлер. Жизнь под свастикой. – М., 2003. – С. 312.
5. ***Райх В.*** Психология масс и фашизм. – СПб.–М., 1997. – С. 97.
6. ***Буллок А.*** Гитлер и Сталин: Жизнь и власть: Сравнительное жизнеописание: в 2 т. – Т. 2. – Смоленск, 1994. – С. 325.
7. ***СС в действии.*** Документы о преступлениях СС. – 2-е изд. – М., 2000. – С. 129.
8. ***Хёне Х.*** Чёрный орден СС. История охранных отрядов. – М., 2005. – С. 295.
9. ***Кох-Хиллебрехт М.*** Homo Гитлер: психограмма диктатора. – Мн., 2003. – С. 42.
10. ***Энциклопедия Третьего рейха*** / Сост. ***В. Тетицын***. – 2-е изд. – М., 2004. – С. 111.
11. ***Шульмейстер Ю.А.*** Гитлеризм в истории евреев. – К., 1990. – С. 118.



*S U M M A R Y*

*This article deals with the racial policy of Nazi Germany towards the Jewish nationality. The author considers racial theory as a theoretical basis for genocide of civilians as well as the policy of Hitler Germany towards the Jewish nationality which resulted in the final solution of the «Jewish Question».*


*Поступила в редакцию 17.02.2006*